# КОНКУРС ІНТЭРНАЦКІХ ПРЫГАЖУНЬ




Зусім нядаўна ў інтэрнаце №3 прайшоў адзін з самых прыгожых конкурсаў – «Міс Вясна-2016». Вось ужо пяты год жыхароў інтэрната радуюць сваімі талентамі абаяльныя і харызматычныя дзяўчаты розных факультэтаў.

Сёлета за ганаровы тытул «Міс Вясна-2016» змагаліся восем прыгажунь: Наталля Калеснікава (2 курс БФ), Анастасія Буслава (3 курс МГФ), Таццяна Яцко (1 курс БФ), Алена Грабоўская (1 курс БФ), Вераніка Мільто (1 курс БФ), Анастасія Новікава (1 курс БФ), Марта Курловіч (1 курс МГФ), Кацярына Дзерваед (4 курс БФ).

Хваляваліся не толькі самі ўдзельніцы, але і гледачы: сябры, суседзі па пакоі, аднагрупнікі, выхавацелі. Падтрымаць дзяўчат мастацка-графічнага факультэта прыйшлі намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце М.А. Шымбарэвіч і старшы выкладчык, куратар 31-й групы МГФ Т.П. Уласевіч. Падтрымліваў дзяўчат на працягу ўсяго вечара і шчыра адорваў іх кампліментамі вясёлы і энергічны вядоўца Глеб Куляшоў (4 курс БФ).

Мерапрыемства пачалося з дэфіле, падчас якога кожная канкурсантка з'явілася перад гледачамі ў прыгожым убранні і была сустрэта гучнымі апладысментамі.

Наступным этапам конкурсу стала «Візітоўка», калі дзяўчаты расказвалі пра сябе. Хтосьці – у форме верша ўласнага сачынення, хтосьці – у форме прозы, а пра кагосьці распавядала сяброўка. Марта Курловіч, напрыклад, прадставіла сябе з дапамогай малюнкаў.




Інтэлектуальны конкурс выявіў разумовыя здольнасці прыгажунь. Вядоўца задаваў пытанні, а дзяўчаты па чарзе на іх адказвалі. Так, на пытанне, якія б войскі канкурсанткі абралі, калі б ім патрэбна было служыць у арміі, Глеб пачуў розныя адказы: войскі сувязі, паветрана-дэсантныя, пагранічныя войскі і нават марскі флот.

Наступным быў конкурс, у якім неабходна было прадэманстраваць свае таленты. Наталля Калеснікава выканала чароўную песню «Паруса надежды», а Алена Грабоўская паказала свае кулінарныя здольнасці: дзяўчына прапанавала журы прадэгуставаць бліны з тварагом, якія яна па-майстэрску ўпрыгожыла. Вераніка Мільто разам з сяброўкай выканала песню «В городе весна», а Таццяна Яцко прачытала верш уласнага сачынення. Надзвычай эфектным было выступленне Кацярыны Дзерваед: прыгажуня разам з Аляксандрам Лявонавым (1 курс БФ) станцавала вальс пад песню «Как упоительны в России вечера». Анастасія Новікава выканала песню «Город тает». Запомнілася ўсім і кранальнае выступленне Марты Курловіч: седзячы за сталом пры запаленых свечках (святло было выключана, а за дзяўчынай стаяў хлопец), яна чытала верш Эдуарда Асадава «Как много тех, с кем можно лечь в постель». Заключным стала выступленне Анастасіі Буславай: разам з сяброўкамі яна выканала стылізаваны народны танец.

Безумоўна, выступленне кожнай канкурсанткі было яркім і запамінальным і кожная з прыгажунь была вартая тытула «Міс Вясна-2016».

Неабходна таксама нагадаць, што за некалькі тыдняў да мерапрыемства было арганізавана інтэрнэт-галасаванне, у якім кожны ахвотны мог аддаць свой голас за тую дзяўчыну, якая яму спадабалася. Таму журы адразу аб'явіла пераможцу ў намінацыі «Міс сімпатый гледача». Ёй стала Марта Курловіч. Прыемна было і тое, што кожная дзяўчына стала пераможцай ў той ці іншай намінацыі: «Міс Рамантыка» – Алена Грабоўская, «Міс Лірыка» – Таццяна Яцко, «Міс Грацыя» – Кацярына Дзерваед, «Міс Творчасць» – Наталля Калеснікава, «Міс Фіерыя» – Анастасія Буслава. Другой віцэ-міс стала Таццяна Мільто, першай – Анастасія Новікава. А тытул «Міс Вясна-2016» атрымала Марта Курловіч. Віншуем пераможцаў!

**Дзіяна ЛОСЬ,**
**студэнтка 5 курса ФлФ.**